Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ

## ЗБОРНІК

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК—1925

38. Заходняя Беларусь Мн. 1925 68с.



Мы пытаемся: што вы зрабілі для „Крэсаў?" Ці вы хоць пробавалі зламаць ша-
лёны нацыяналізм і сьляпы шовінізм? Ці вы хоць пробавалі вытлумачыць вашым вы-
барщчыкам, што 30 проц жыхарства дзяржавы ня можна ўціскаць без канца, што Поль-
шча не павінна быць турмою народаў, што штыком і бізуном можна захапіць увесь сьвет,
але ня можна ім кіраваць?

Ці вы хоць раз трэбавалі права самавызначэньня для ўкраінцаў і беларусаў? Ці ў
працягу 2 гадоў пісиуў хто-небудзь з вас хоць аб тэрыторыяльнай аўтономіі, аб якой так
прыгожа напісана ў програме „Вызваленьня?"

З усіх партый у Польшчы адна толькі Комуністычная Рабочая
Партыя Польшчы на II зьезьдзе прызнала поўнае права Заходняй Бела-
русі на самавызначэньне аж да поўнага аддзяленьня ад Польшчы. Гэ-
тым быў паложаны моцны мост дзеля збліжэньня беларускага нацыяналь-
нага руху з рухам комуністычным. Соймавая дзейнасьць беларускіх дэ-
путатаў пераконвала іх, што адзіным іх саюзьнікам у змаганьні за леп-
шую будучыну заходня-беларускіх сялянскіх мас могуць быць толькі
комуністыя. Гэты процэс паступовага збліжэньня нарэшце выявіўся рэ-
альнымі адзнакамі. „Robotnik" за 13-е сьнежня паведамляе аб „тэхніч-
ным блёку беларускага і ўкраінскага клюбу (які прайшоў падобны-жа
шлях, які і беларускі клюб) з комуністымі дзеля супольнага прадстаў-
ніцтва ў соймавых комісіях. Няхай сабе гэты блёк застаецца толькі „тэх-
нічным", але ўсё-ж такі гэта першы формальны выраз збліжэньня. Пасьля
далучэньня да комуністычнае фракцыі 4-х сяброў б. ўкраінскае соцыял-
дэмократычнае партыі фракцыя мае 6 сяброў, украінскі клюб (пасьля
выхаду Васыньчука А., Махнюка і 4 цяперашніх комуністых) мае 14 сяб-
роў і беларускі клюб (соймавы)—8 сяброў, значыць разам блёк будзе
мець 28 галасоў, а пры такім-жа „тэхнічным" паразуменьні з незалежнаю
сялянскаю партыяй—34 галасы. Значэньне і нацменшасьцяй і комуністых
у соймавых комісіях, а тым самым і ў Сойме павялічваецца. Недарма
ўся польская буржуазія і ўсе польскія буржуазныя газэты трэбуюць ска-
саваньня дэпутацкае недатыкальнасьць ў адносінах да гэтых дэпутатаў.
Недарма польскія партыі правялі ў сойме выдачу суду т. Ланцуцкага і
трох сяброў украінскага клюбу.

Уплывы Комуністычнае Партыі Заходняе Беларусі (аўтономнае част-
кі Ком. Раб. Парт. Польшчы) узрастаюць бязупынна. У лістападзе г. г.
пачаў выходзіць нелегальна „Чырвоны Сьцяг", орган Ц.К. Ком. Парт. Зах.
Бел. Недалёка той момант, калі чырвоны сьцяг рабоча-сялянскае рэво-
люцыі аб'яднае вакол сябе ўсе працоўныя масы сучаснае Польшчы бяз
розьніцы нацыянальнасьці і павядзе іх на бой за вызваленьне працоўных
з-пад усякага прыгнёту—соцыяльнага і нацыянальнага.

---

**А. Смоліч.**

# Сялянства Заходняй Беларусі.

*(Яго сучаснае палажэньне).*

Цяжкія ўмовы клясавага і нацыянальнага прыгнечаньня ў пасьлява-
енны час зрабілі заходня-беларускае сялянства дужа паважным дзейнікам
сусьветнай рэволюцыі. Да яго шматахвярнай няроўнай барацьбы з капі-
талістычнай Польшчай з вялікай трывогай прыглядаецца буржуазны сьвет,
з захапленьнем і подзівам—працоўныя і прыгнечаныя масы ўсіх краёў, а
перад усім пролетарыят і сялянства Савецкай Беларусі, адзінай вольнай
часткі вялікай усебеларускай суцэльнасьці. Усім ясна, што якраз Заход-
няй Беларусі, гэтай, можа, больш за Бэльгію і паўночную Францыю зьні-
шчанай старане, прыдзецца ў недалёкім часе ізноў зрабіцца тэатрам шы-
рокай збройнай барацьбы, якая, уласьціва кажучы, ужо й пачалася ў відзе
партызанскай вайны беларускага сялянства з польскай дзяржавай; кож-
наму зразумела, што ад вынікаў гэтай барацьбы ў старане, якая ляжыць
на ўзьмежжы соцыялістычнага і капіталістычнага сьвету, залежыць част-
каю і справа пасуваньня сусьветнае рэволюцыі на захад, а вынікі гэтыя ў
свой чарод ня мала залежаць і ад вытрываласьці ды рэволюцыйнага духу
заходня-беларускага сялянства.

Сучасная Польшча, відаць, цьвёрда пастанавіла быць не мастом, а
каменным мурам між Савецкім Саюзам і Заходняй Эўропай. Каб аддзя-
ліць Савецкую Беларусь ад Літвы ды Нямеччыны і захапіла яна, паводле
рэцэпту Станіслава Грабскага, віднейшага прадстаўніка польскай рэак-
цыі, беларускія землі, ствараючыя г. зв. „калідор Грабскага", што пра-
цягнуўся ад Палесься да Латвіі вузкай і доўгай (кілёмэтраў на 500) па-
ласой. Калідор гэты закрывае гандлёвыя шляхі з Савецкай Беларусі на
захад, спыняе сплаў дрэва па Нёмне, ня кажучы ўжо аб тым, што зу-
сім штучна аддзяляе ад Беларусі яе жывую частку, якая таксама апыну-
лася ў экономічным тупіку, адрэзаная ад усіх сваіх рынкаў і зьвязаных
з ёю экономічна пастораў. Штучнасьць гэтага сіламоц праведзенага
падзелу Беларусі не абяцае яму даўгога веку. Той „кітайскі мур", якім
буржуазія Антанты і перад усім польская хацела засланіцца ад чырвонае
здані, аказваецца ўжо ў нашыя дні вельмі нятрывалым і няпэўным. Па-
куль, аднак, гэты мур існуе, да яго трэба як найуважней прыглядзіцца з
розных бакоў, трэба наглядаць Заходнюю Беларусь з значна большай
энэргіяй і пільнасьцю, чым гэта робіцца. Нагляданьню гэтаму павінен пад-
лягаць ня толькі політычны і грамадзкі бок жыцьця Заходняй Беларусі;
у грунце політычных падзей і сьвядомасьці грамадзкіх кляс і груп
ляжаць экономічныя і прыродныя зьявішчы, апошнія неабходна ведаць
для разуменьня першых і наогул усяго жыцьця краю. Гаворачы аб за-
ходня-беларускім сялянстве, мы перад усім паглядзім, у якіх вытворчых
абставінах яно жыве і працуе. Пры гэтым мы будзем карыстацца, галоў-
ным чынам, матар'яламі, публікаванымі ў Віленскай беларускай прэсе, а

падку мясцовы падпанак, а ў большасьці—прысланы з Польшчы ўрадовец, часта з цёмнай біографіяй. Павятовыя соймікі існуюць больш для блізіру, бо кіруе паветам самаўладца-стараста. Але нават у гэткія бязуладныя самаўрады стараюцца ўсякімі спосабамі, увесь час ламаючы закон, не дапусьціць беларускага селяніна. Прывыкшы ламаць закон дзеля мэт політычных, польскія дзеячы самаўрадаў ламаюць яго і дзеля сваіх асабістых карысьцяй. Хабарніцтва, ашуканства бяскарна пануюць у „крэсавай“ гміне. А на ўтрыманьне яе сялянства змушана плаціць вялізныя падаткі. Гэтак месячны бюджэт Празароцкае гміны—каля 1.500 злотых (600 рублёў).

Беларусы ў Польшчы, можна лічыць, ня маюць грамадзянскіх праў. Адзін раз толькі ўдалося ім зьдзейсьніць сваё права, гэта пры выбарах у Сойм, калі сам польскі ўрад быў зацікаўлены ў тым, каб насяленьне далучаных краін прымала ўдзел у выбарах, гэтым нібы згаджаючыся на сваё далучэньне да Польшчы. Ня гледзячы на ўсе высілкі польскіх партый, у Сойм прайшлі беларускія дэпутаты ў даволі значным ліку. Трэба думаць, аднак, што і гэтая магчымасьць выяўленьня свае волі будзе ў беларускага сялянства адабрана пры новых выбарах; польскія партыі рыхтуюць новы выбарны закон, галоўная мэта якога—ня пусьціць у Сойм прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяй, перад усім—беларусаў.

Усе зьдзекі і катаваньні і тое бяспраўнае палажэньне, у якое трапіла беларускае сялянства ў Польшчы, зносіць яно пакуль што пакорна. У заходня-беларускай вёсцы яшчэ жывуць успаміны аб прыгоне—страшным беларускім прыгоне, якога ня знала сялянства суседніх краёў. Успаміны гэтыя аджылі цяпер у „дэмократычнай“ Польшчы, аджыла і прыгонная псыхолёгія, на што бязумоўна разьлічае польская політыка. Гэтым толькі і можна растлумачыць, чаму польская адміністрацыя дазваляе сабе ў Заходняй Беларусі тое, што ні ў якім разе ня можа дазволіць у далучаных нямецкіх краінах, ва Ўсходняй Галіцыі, а нават на Валыні. Падзеі, аднак, вучаць і беларускага селяніна. З шэрай і пакорнай масы ўжо выдзяляюцца больш адважныя, больш амбітныя, якія ня могуць зьнесьці біцьця па твары і пачынаюць партызанскую вайну з Польскай дзяржавай. Ня гледзячы на рэчкі крыві паўстанцаў і зусім нявінных людзей, якіх хапаюць замест паўстанцаў,—лік нападаў на панскія двары, на ўрадоўцаў і асаднікаў, на месты і паязды—усё ўзрастае, напады робяцца ўсё адважнейшымі і пагражаюць самому існаваньню польскай улады ў Заходняй Беларусі дый сувязі апошняе з Польшчай.

## Экономічная політыка польскага ўраду.

Гэткія вынікі політычнай сыстэмы, уведзенай польскім урадам у Заходняй Беларусі. Нельга сказаць, каб вельмі ўдачнай была і экономічная політыка, а перад усім вайсковая колёнізацыя. Апошняя ў кожным разе ня спраўдзіла надзей, ускладаных на яе польскай буржуазіяй. На пачатак 1923 году ў беларускіх ваяводзтвах было нарэзана 2.628 асаднікам 62 тыс. гэктараў. За 1923 год лік асаднікаў блізка што падвоіўся, бо з 5.600 па ўсім усходнім ваяводзтвам вырас да 9.200. Лік вайсковых, жадаючых атрымаць зямлю, быццам даходзіць да 99 тысяч. Верачы гэтай нават лічбе і лічачы, што на Заходнюю Беларусь іх пойдзе каля палавіны (рэшта на Валынь), мы можам спадзявацца, што ў самым памысным для колёнізацыі выпадку прыбудзе ў Заходняй Беларусі 50 тыс. польскіх сем'яў,—а значыць, толькі дзесятая частка існуючага насяленьня, а гэта да польскае большасьці яшчэ далёка. Аднак такія разьмеры колёнізацыі былі-б магчымы хіба пры правядзеньні шырокае мэліорацыі ў Палесьсі, да чаго польскі ўрад і ня думаў прыступаць. Трэба ведаць, што дагэтуль асаднікам наразалася зямлі па 25—30 гэктараў, прычым



парцэлявалася зямлі, галоўным чынам, расійскіх абшарнікаў. Хаця, паводле закону аб аграрнай рэформе, на парцэляцыю павінна пайсьці ўся зямля двароў звыш 400 ha (у Усходніх ваяводзтвах), аднак усе спробы захапіць двары польскіх абшарнікаў выклікалі вялізнае абурэньне сярод апошніх, якія лічаць сябе і свае двары—апораю польскае дзяржаўнасьці і ні на якія ўступкі, нават дзеля такой патрыотычнай справы, як вайсковае асадніцтва, ісьці ня хочуць. І зразумела, што калі вычарпаецца запас зямлі расійскіх абшарнікаў, што ўжо мусіць хутка і будзе,—вайсковая колёнізацыя ня будзе мець шансаў на далейшае пашырэньне, бо адабраць зямлю ад польскіх абшарнікаў у сколькі-небудзь значным ліку зможа толькі аграрная рэволюцыя. З настрояў сялянства, аднак, зусім ясна, што будучая рэволюцыя вялікай розьніцы між абшарнікамі і асаднікамі рабіць ня будзе і баржджэй усяго зьмяце як адных, так і другіх бяз сьледу.

Тымчасам на вайсковае асадніцтва Польская дзяржава траціць вялікія сродкі, бо фактычна толькі яно і засталося ад шырока-абяцанай зямельнай рэформы. Ня гледзячы на гэта, толькі нязначная частка (*ня* больш 30 проц.) асаднікаў пабудавалася і сама ўзялася за гаспадарку. Большасьць асаднікаў, як піша польскі аўтар K. Srokowski, „абцяжаны адным з няхватаў—ці капіталу, ці ўмеласьці, ці ахвоты да земляробства, часта мае па два гэтых *няхваты*, а яшчэ гасьцей усе тры“, бо зямля даецца людзям, якія нічога супольнага з гаспадаркай ня мелі і разглядаюць сваю асаду выключна, як спосаб, каб за нешта „зачапіць рукі“. Тымчасам акалічнае сялянства, маючы па 2-5 дзесяцін на гаспадарку, лічыць, што ад яго адабрана зямля, зрошаная потам яго бацькоў і дзядоў, і адносіцца да асаднікаў з няменшай ненавісьцю, чым нават да абшарнікаў. Трэба сказаць, што асаднікі часта непасрэдна крыўдзяць сялян, адбіраючы ад іх сэрвітуты, выконваючы шпіёнскую і поліцэйскую работу. Але з другога боку асаднікамі ня вельмі здаволены і польскія політыкі. Рэч у тым, што асаднікі часамі ня вельмі рвуцца выпаўняць заданьні нацыяналістычнае політыкі і з гэтага боку выяўляюцца іншы раз даволі неспадзяваныя кур'ёзы. Так у часе соймавых выбараў частка асаднікаў на Валыні, мусіць дзеля падтрыманьня добрых адносін з мясцовым насяленьнем, разам з ім галасавала за няпольскія сьпіскі. Банкроцтва ўсяе колёнізацыйнае політыкі становіцца выразным нават і для шмат каго з польскага буржуазнага грамадзянства. Пачынаюць раздавацца галасы і за тое, каб хоць трохі задаволіць зямельны голад мясцовага сялянства.

Да гэтай пары зямельная рэформа нічога не дала сялянству Заходняй Беларусі. Наадварат, ад яго яшчэ ў многіх выпадках паадбіралі сэрвітуты—права пасьвіць скаціну па лесе і наагул па дворнай зямлі. Польскі міністар Копчыньскі, выступаючы ў Сойме, заявіў, што зямельная рэформа праведзена ў Польшчы на 4 *проц.* У Заходняй Беларусі бязумоўна і невялікай часткі гэтай „рэформы“ ня бачылі. Мясцамі адбываецца комасацыя—перавод вёсак на хутары, прычым за гэтую работу з сялян бярэцца вялізная плата. У большасьці-ж выпадкаў зямельная рэформа зводзіцца да таго, што зямельныя парцэлі атрымоўваюць мясцовыя польскія ўрадоўцы. Зямельныя ўлады гэтак клапоцяцца, каб лішні кавалак зямлі не перайшоў да беларускага селяніна, што нават дворныя вучасткі, якія знаходзяцца ў шахаўніцы з сялянскай зямлёй і якія безьзямельныя сяляне-ж увесь час дагэтуль арэндавалі—аддаюць пры парцэляцыі двароў якім-небудзь староньнім падпанкам, як гэта мела месца ў двары Плянты.

## Адбудова і лясныя парадкі.

Політыка барацьбы з беларускім элемэнтам, яго вынішчэньне выяўляецца і ў справе адбудовы зруйнаваных вайною будынкаў. Да гэтага часу ўздоўж старога нямецкага фронту ад Дзьвінску да Пінску шырокім поясам ляжыць дазваньня зруйнаваная старана, насельнікі якой жывуць

у зямлянках. На 1 студзеня 1923 г. лік зьнішчаных і адбудаваных будынкаў быў такі:

| Ваяводзтвы. | Усяго зьнішчаных будынкаў. | Адбудавана з гэтага % % |
|---|---|---|
| Беластоцкае . | 192.962 | 48 |
| Палескае . . | 173.858 | 22 |
| Наваградзкае. | 127.037 | 46 |
| Віленскае . . | 64.908 | 44 |

Тады як у беларускіх ваяводзтвах адбудавана 22—48%, у польскіх адбудавана ад 50 да 91%. Дый наогул трэба сказаць, што помач польскага ўраду пры адбудове Заходняй Беларусі—была мінімальная; большая частка сялян адбудавалася ў часе савецкага наступу 1920 году. Урадоўцы па адбудове, якіх існуе даволі многа і ў Зах. Беларусі, займаюцца больш адбудовай урадавых гмахаў, дапамагаюць асаднікам і дваром, селяніна-ж перад усім пытаюць, ці ён паляк ці беларус і ў залежнасьці ад адказу даюць дапамогу на адбудову або не. Часта, аднак, нават атрымаўшы дазвол на дрэва для будоўлі, фактычна сяляне яго не атрымоўваюць. Тымчасам асаднікі спэкулююць на атрыманых будаўляных матар'ялах, а і самы ўрадоўцы па адбудове дапускаюць розныя надужыцьці.

Вялікай крыўдай для заходня-беларускага сялянства ёсьць лясныя парадкі. Паны, павяртаўшыся да сваіх двароў пасьля 1920 году, у большасьці зусім закрылі доступы да лесу мясцовэму сялянству. Затое, чуючы недаўгавечнасьць свайго панаваньня, яны пачалі шырокую распрадажу дрэў буйным гандляром. Лясоў цяпер лічыцца ў Віленскім ваяводзтве—28,2%, у Наваградзкім—25,5. Калі-б не ахоўваючыя лясы законы, дык пэўна ў бліжэйшыя-ж гады ад дворных лясоў мала што і засталося. Праўда, урад сам паказвае прыклад спусташаючае лясы гаспадаркі. Белавеская пушча, якую шкадавалі нішчыць нават нямецкія окупанты, цяпер прадана для эксплёатацыі ангельцам на 12 год і тыя штогод сякуць у пень 1.500 гэктараў. Трэба спадзявацца, што на месцы першабытнае пушчы хутка парастуць бескаштоўныя бярэзьнікі, бо дастатачнага штучнага залясеньня ня робіцца. Ужо ляжыць пасекаю 5.000 ha, а за прошлы год засеяна лесам усяго толькі 314 ha.

Сялянства Заходняй Беларусі ня можа атрымаць з панскага лесу ня толькі будаўлянага матар'ялу, але нават і дроў. Па дровы прыходзіцца часамі езьдзіць за 40 вёрст, шукаць ласкавейшага пана, які-б дазволіў за грошы купіць дроў.

### Падаткі.

У дадатак да ўсіх прасьледваньняў і цяжкога экономічнага і праўвага палажэньня селянін павінен плаціць вялізарныя падаткі, каб умацаваць фінансы дзяржавы, каб падтрымаць усю тую політычную сыстэму, якая яго гняце і прыціскае. Разьмеры ападаткаваньня ня лёгка выявіць; аб падатках ня ведае добра наперад і сам гаспадар, які плоціць, бо лік гэтых падаткаў вялікі і няўсталены. Важнейшыя з падаткаў: ад зямлі, ад маемасьці (спэцыяльна на падтрыманьне валюты), ад спадчыны, дзяржаўны, ваяводзкі, павятовы („на соймік"), гмінны. Абавязковае страхаваньне чамусьці каштуе надта дорага—каб яго заплаціць, трэба прадаць пудоў 20 жыта (допіс у № 1 „Сына Беларуса"). Праўда, пазьней офіцыяльна тлумачылася, што страхавыя тарыфы павінны быць ня больш даваенных. Як падае тая-ж газэта „Сын Беларуса", на 1 душу насяленьня прыходзіцца



ў Польшчы цяпер 41 злоты падаткаў (каля 15 руб.), тады як у даваенныя часы прыходзілася 30,5 злотых. Зразумела, што збураная вайною Заходняя Беларусь ніякай падатковай палёгкі не дастае і плоціць ня менш, калі ня больш за іншыя часткі Рэчыпаспалітай.

Апроч гэтых сталых падаткаў, існуе яшчэ цэлы рад збораў і павіннасьцяй. Зьбіраюць спэцыяльныя падаткі на ўтрыманьне польскіх школ, у якія сяляне дзяцей не пасылаюць—і тады штрафы за тое, што не пасылаюць, асобы падатак на ўтрыманьне стайковых коняй—для паездак урадоўцаў (падатак не малы—у іншых гмінах, напр., у Шаркоўшчыне—да 6 пуд. збожжа з гаспадара), урэшце ўсякія падаткі і павіннасьці на ўтрыманьне і направу дарог. Практыкуецца і натуральная падводная павіннасьць—для перавозкі ўрадоўцаў і вайсковых. Адным словам, палічыўшы ўсе падаткі, выходзіць, што заходня-беларускі селянін павінен плаціць гэтулькі, як значна багацейшы ад яго італьлянскі селянін.

Асабліва цяжкае ўражаньне робіць спосаб збору падаткаў. Улада не клапаціцца нават аб тым, каб перахаваць надалей платную здольнасьць беларускага селяніна: ад яго адбіраюць за падаткі апошняга каня ў рабочую пару, забіраюць апошнюю карову, адзежу і хатні спрат, абяртаючы гаспадара ў поўнага жабрака. Калі прыняць пад увагу погляд пануючых польскіх груп на беларускага селяніна, як на непажаданы элемэнт, падлягаючы вынішчэньню, дык такі спосаб зьбіраньня падаткаў ёсьць найбольш адпаведным—ён пазбаўляе селяніна магчымасьці далей працаваць на зямлі.

Дый сам па сабе цяжар падаткаў бязумоўна непасільны ня толькі для беларуса, а і для польскага селяніна. Падаткі забіраюць ад селяніна ўсе сабраныя ім лішкі і не даюць магчымасьці адбудавацца; мала таго, яны моцна зачапляюць і асноўныя капіталы. Фінансы Польшчы, якія сыстэматычна расьцягвала польская буржуазія, мусяць папраўляць працоўныя масы Польшчы коштам вялікіх ахвяр. Ня дзіва, што занадта моцна нацягнутая падатковая струна часамі рвецца. Усё польскае грамадзянства было перапалохана, калі вясною гэтага году выбухнула паўстаньне курпяў—невялічкага сялянскага племеньня, якое жыве ў паўночнай Польшчы. Курпі адзначаліся сваім нацыянальна-польскім настроем; у барацьбе за незалежнасьць Польшчы яны прымалі вельмі актыўны ўдзел. І вось гэтыя самыя курпі ня вытрымалі падатковага цяжару і адмовіліся плаціць падатак. Проці іх паслана была цэлая карная экспэдыцыя, сьцягнута паліцыя аж з трох паветаў, якая пачала гвалтам адбіраць маемасьць ад курпяў, як гэта робіцца ўвесь час у беларускіх землях. Тады курпі збунтаваліся. Паўстаньне іх затоплена ў крыві.

Мясцамі і беларускія сяляне цэлымі гмінамі адмаўляліся плаціць падаткі. Гэтак адмовілася Вайстоменая гміна Сьвянцянскага павету, большасьць насяленьня якой жыве ў зямлянках. Аб выніках гэтае адмовы мы ня ведаем.

На заканчэньне мусім мы адзначыць яшчэ адну асаблівасьць палажэньня заходня-беларускага сялянства. Няма надзеі, што палажэньне гэтае палепшыцца пры зьмене ўраду, пры пераходзе ўлады ад аднае да другое групы польскае буржуазіі. Прыклад недалёкага мінулага сьведчыць, што як буйная, так і дробная буржуазія Польшчы, пачынаючы ад Ст. Грабскага і да розных пэпэсаўскіх „соцыялістых" кшталтам Недзялкоўскага, мае, уласьціва кажучы, адну праграму адносна беларусаў; выражаецца гэтая праграма ў двух словах—колёнізацыя і полёнізацыя. Надзеі на паправу адносін няма. Селянін Заходняе Беларусі трапіў у такое палажэньне, з якога няма выйсьця ў межах „дэмократычнае" Польшчы. З кожным днём яму робіцца ўсё больш зразумела, што выйсьце можа быць толькі ў соцыяльнай рэволюцыі і далучэньні краю да Савецкай Беларусі. Аб гэтым цяпер толькі й марыць Заходняя Беларусь. У ёй жывуць успамінамі аб нядаўнім, хоць нядоўгім часе Савецкае ўлады над

Нёмнам і Вільлёй, калі селянін пачуў сябе вольным чалавекам, калі ён мог адбудоўваць гаспадарку і будаваць новае жыцьцё. З другога боку вялікія культурныя здабыцьці Савецкай Беларусі ня могуць не абуджаць самыя адсталыя сялянскія масы, не рэволюцыянізаваць іх. Існаваньне і разьвіцьцё Савецкай Беларусі і для ворагаў і прыяцеляў заходня-беларускага сялянства і для яго самога ёсьць найпэўнейшай гарантыяй таго, што разбойніцкія пляны польскае буржуазіі не ўдадуцца, ня могуць удацца.

---

Я. Л-ч.

## Наступ капіталу ў Польшчы.

Сучасная Польшча была ўтворана дзяржавамі-пераможцамі Антанты, як шмат другіх дробных паваенных дзяржаў з мэтай барацьбы проціў рэволюцыі, якая грознай хваляй падыходзіла з усходу, пагражаючы змыць капіталістычны лад Заходняй Эўропы. Гэта былі далёка высунутыя на ўсход форпосты Антанты, з якіх разьлічалі распачаць пры дапамозе расійскай контр-рэволюцыі вайну з пролетарскай рэволюцыяй. З другога боку ўтварэньнем гэтых дзяржаў Антанта нажывала сабе і поўны моральны капітал. Як ведама, абедзьве змагаючыяся групы імпэрыялістычных дзяржаў упарта і галосна крычалі, што яны вядуць вайну за вызваленьне паняволеных народаў, за права гэтых народаў да самастойнага дзяржаўнага жыцьця. Творачы на руінах пераможаных дзяржаў рад дробных, дзяржавы Антанты як быццам ажыцьцяўлялі гэты лёзунг; праўда, утварэньне Польшчы, Чэха-Славакіі, Юга-Славіі, эбуйненьне Румыніі ні трошкі не разьвязалі нацыянальнага пытаньня ў цэнтральнай Эўропе, наадварот—нацыянальныя супярэчнасьці тут яшчэ больш павялічыліся. Новаўтвораныя дробныя жываглоты, захапіўшы вялікія абшары, заселеныя народамі іншай нацыянальнасьці, аказаліся яшчэ больш драпежнымі, чым вялікія даваенныя дзяржавы, на руінах якіх яны паўсталі.

Сучасная Польшча, захапіўшая вялікія абшары, заселеныя беларусамі і ўкраінцамі, зьяўляецца найбольш яскравым прыкладам гэтага тыпу дробных паваенных жываглотаў—вогнішчам нацыянальнага ўціску і соцыяльнай рэакцыі. Шмат для каго можа паказацца незразумелым, чаму ў Польшчы не магла ўмацавацца рэволюцыя, калі здавалася-б вонкавыя абставіны спрыялі гэтаму, дзякуючы з аднаго боку яе географічнаму палажэньню паміж двума магутнымі вогнішчамі рэволюцыі—СССР і Нямеччынай, а з другога—формаваньню яе, як дзяржавы ў момант найбольшага пад'ёму рэволюцыйнай хвалі ўва ўсёй Эўропе. Гэтым спрыяючым вонкавым абставінам якраз ня спрыяў уклад суадносін рэальных соцыяльных сіл у самой Польшчы.

У часе сусьветнай вайны польская прамысловасьць была разбурэна. Калісьці моцны, добра з'арганізованы пролетарыят Польшчы к моманту ўтварэньня Польшчы, як незалежнай дзяржавы, быў разьбіты, распарушаны, неаб'яднаны і фактычна не прадстаўляў з сябе сілы, якая б магла адыграць рашаючую ролю. Работніцкая кляса зьяўляецца сілай тады, калі яна з'арганізована навакола сваіх варштатаў працы, калі яна можа ўзяць іх у свае рукі і адыграць рашаючую ролю ў экономічным жыцьці краю,—гэтых варункаў якраз тады і ня было. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што, дзякуючы нацыянальнаму ўціску, які перажыў польскі народ пад нямецкім і расійскім панаваньнем, патрыотычны шовінізм пусьціў моцныя карані сярод работніцкіх мас, якія знаходзіліся бадай пад выключным уплывам пэпэсаўцаў і іх правадыра Пілсудзкага. А соцыял-шовіністыя заўсёды былі і будуць здраднікамі працоўных і паслугачамі бур-